ЛІТАРАТУРА

1. *Каплунович И. Я.* Уровни познавательной деятельности // Математика. 2002. 24—30 окт.
2. *Левитас Г. Г.* Введение в геометрию // Математика в школе. 1990. № 6.
3. *Обухова Л. Ф.* Концепция Жана Пиаже: за и против. М., 1981.
4. *Подходова Н. С.* К проблеме личностного ориентированного обучения геометрии // Математика в школе. 2000. № 10.
5. *Подходова Н. С.* Формирование пространственных представлений младших школьников при изучении геометрического материала: Автореф. дис. ... канд. пед. наук. СПб., 1992.
6. *Рослова Л. О.* Геометрическая линия нового учебника для V—VI классов // Математика в школе. 1999. № 5.
7. *Скоробогатов В. А., Коновалов Л. М.* Феномен воображения. СПб., 2002.
8. *Субботина Л. Ю.* Развитие воображения у детей. Яр., 1996.
9. *Шарыгин И. Ф.* Рассуждения о концепции школьной геометрии. М., 2000.
10. *Якиманская И. С.* Возрастные и индивидуальные особенности образного мышления учащихся. М., 1983.
11. *Якиманская И. С.* Знания и мышление школьника. М., 1985.
12. *Якиманская И. С.* Развитие пространственного мышления школьников. М., 1982.

SUMMARY

*The analysis of psychologist's researches concerning the question of the development of man's cognitive process is given in the article. There is a short summary of introductory course of geometry and methods of teaching.*

---

*УДК 373.2*

***Дз. М. Дубініна***

# ФАРМІРАВАННЕ Ў ДАШКОЛЬНІКАЎ НАВЫКАЎ ТЛУМАЧАЛЬНАГА МАЎЛЕННЯ

Авалоданне вусным маўленнем — адзін з найбольш значных здабыткаў чалавека. Слова з'яўляецца сродкам зносін паміж людзьмі, спосабам абмену інфармацыяй, інструментам уздзеяння на свядомасць і ўчынкі іншага чалавека. Разам з тым «дар слова» (моўная здольнасць) выступае як састаўная частка агульнай культуры чалавека, яго адукаванасці, узроўню яго духоўнага развіцця.

На працягу ўсяго дашкольнага дзяцінства педагогі і бацькі накіроўваюць свае намаганні на развіццё ў дзяцей уменняў «раскрыць думку ў звязным маўленчым выказванні» (С. Л. Рубінштэйн). Сам працэс узнікнення вуснага звязнага маналагічнага выказвання ў дзіцяці, а таксама яго афармленне залежаць ад шэрага экстралінгвістычных фактараў.

У залежнасці ад аб'екта і мэты маўлення ўсе маналагічныя выказванні падзяляюцца на апісанне, апавяданне, разважанне. Самым скпаданым тыпам тэксту для дзіцяці дашкольнага ўзросту з'яўляецца разважанне.

Яно непасрэдна звязана з развіццём у дашкольнікаў мысліцельных аперацый. Спасцігаючы законы лагічнага мыслення, старэйшы дашкольнік адначасова авалодвае і навыкамі тлумачальнага маўлення. Ён вучыцца супастаўляць і абагульняць, аргументаваць, абгрунтоўваць, рабіць вывады.

У праграме па развіцці маўлення дзяцей дашкольнага ўзросту (пад рэд. А. С. Ушаковай) разважанне характарызуецца як тэкст, які ўключае прычынна-выніковыя канструкцыі, пытанні, ацэнку.

Яго структура скпадаецца з тэзіса, аргументацыі і выведу. У праграме падкрэсліваецца, што структура разважання не з'яўляецца жорсткай, доказы вылучанага тэзіса могуць давацца ў рознай паслядоўнасці. У разважанні могуць даказвацца не адно, а некалькі палажэнняў, можа быць зроблена некалькі вывадаў ці адзін абагульнены.

Неабходна адзначыць, што ўзровень разважання дзіцяці сведчыць аб яго разумовым развіцці, аб яго інтэлектуальнай падрыхтаванасці да школы.

Разважаць слоўна дзеці спрабуюць у малодшым дашкольным узросце. Але, як правіла, за такімі разважаннямі не стаіць вопыт дзіцяці, яго веды. Доказам гэтаму служаць разважанні дзяцей, прыведзеныя К. І. Чукоўскім у кнізе «От двух до пяти», якая ўяўляе сапраўдную скарбніцу дзіцячага маўлення. Прыклады некаторых дзіцячых разважанняў: «Море — это с одним берегом, а река с двумя», «Собаки нужны охотнику, чтобы на него зайцы не напали», «Страус — это жирафа, только птица он».

Разважанні дашкольнікаў будуюцца па асаблівай логіцы. Яны, як адзначае К. І. Чукоўскі, заснаваны на асацыяцыі ці па сумежнасці, ці па падабенстве.

Разам з тым даследчык дзіцячага маўлення сцвярджае, што ў гэтым узросце (нягледзячы

на тое, што меркаванні дзяцей носяць памылковы характар) важна заўважыць тыя адмысловыя прыёмы мыслення, якімі аперыруе дзіця нават тады, калі робіць памылкі. Па меркаванні К. І. Чукоўскага, памылкі будуць пераадолены жыццёвай практыкай, а навыкі прычынна-выніковага тлумачэння фактаў застануцца ў дзіцяці назаўсёды.

Такім чынам, для таго каб разважаць, старэйшаму дашкольніку неабходны запас канкрэтных ведаў і жыццёвага вопыту.

Даныя даследаванняў у галіне разумовага развіцця дзяцей пацвярджаюць, што старэйшыя дашкольнікі могуць засвоіць не толькі асобныя факты, але і веды, якія звязаны з разуменнем узаемасувязей паміж прадметамі і з'явамі навакольнага свету. У даследаваннях С. Л. Рубінштэйна і А. Р. Лурыя пацвярджаецца, што дзіця рана пачынае заўважаць элементарныя прычынныя залежнасці і рабіць высновы. Аднак гэта не сведчыць пра тое, што дзеці могуць растлумачыць прычыны разнастайных з'яў, заўважыць абагульненасць сэнсу. Менавіта таму выхавальнік павінен імкнуцца да таго, каб дзіця магло атрымаць як мага больш разнастайных уяўленняў і ведаў аб навакольным свеце.

Цяжкасці выказванняў тыпу разважанняў звязаны і з тым, што яны характарызуюцца складанасцю сваёй пабудовы. Дзеці дашкольнага ўзросту яшчэ не валодаюць у дастатковай ступені уменнем выкарыстоўваць спецыяльныя моўныя сродкі, якія неабходны для сувязі сэнсавых частак тэксту такога тыпу.

Вядомы педагог, даследчык у галіне маўленчага развіцця дзяцей дашкольнага ўзросту В. І. Яшына адзначае, што навучанне дзяцей цэласным звязным разважанням, прадугледжвае фарміраванне ў іх уменняў выдзяляць істотныя прыметы прадметаў для доказу вылучаных тэзісаў і ўменняў, накіраваных на выкарыстанне разнастайных моўных сродкаў для пабудовы выказванняў тыпу разважанняў.

У маўленчым развіцці дзяцей асноўнымі задачамі працы выхавальніка па фарміраванні навыкаў і ўменняў састаўлення выказвання тыпу разважання з'яўляюцца:

- навучанне дашкольнікаў пабудове цэласных звязных выказванняў тыпу разважання;
- фарміраванне уменняў дашкольнікаў выкарыстоўваць розныя моўныя сродкі для сувязі сэнсавых частак выказвання тыпу разважання;
- фарміраванне ўменняў дзяцей выдзяляць істотныя прыметы прадметаў для доказу вылучаных тэзісаў;
- навучанне дашкольнікаў уключэнню элементаў разважання ў іншыя тыпы выказвання (кантамінацыя).

Найбольшым дасягненнем дашкольнікаў лічыцца ўключэнне элементаў разважання ў іншыя тыпы выказвання (кантамінацыя). Пры гэтым адной з галоўных умоў для фарміравання ў дзяцей умення разважаць даследчыкі называюць арганізацыю змястоўных зносін выхавальніка з дзецьмі і дзяцей аднаго з другім. Па іх меркаванні, менавіта ў працэсе змястоўных зносін ствараюцца сітуацыі, якія патрабуюць вырашэння пэўных праблем, што ў сваю чаргу пабуджае дзяцей да выкарыстання моўных сродкаў, якія характэрны для звязных выказванняў тыпу разважанняў. Пры гэтым аб'ём дзіцячых выказванняў тыпу разважанняў залежыць перш за усё ад сітуацыі зносін, тэмы і пастаўленай мэты.

Найбольш глыбокаму пазнанню дашкольнікамі рэчаіснаці спрыяюць назіранні і элементарныя вопыты.

Уключэнне маўлення ў гэтыя спосабы спасціжэння дзіцем навакольнага свету прыводзіць да перабудовы пачуццёвага пазнання. У той жа час назіранні і элементарныя вопыты выступаюць як спосабы пазнання дзіцем навакольнага свету, мэтай якіх з'яўляецца вырашэнне пазнавальнай задачы. У працэсе яе вырашэння дзеці пад кіраўніцтвам выхавальніка здзяйсняюць аналіз, вылучаюць меркаванні, робяць вывад. Растлумачваючы той ці іншы факт, аргументуючы пэўны пункт гледжання, раскрываючы прычынна-выніковыя сувязі і адносіны, дзіця выкарыстоўвае складаназалежныя сказы, дзеяслоўныя спалучэнні, назоўнікі з прыназоўнікамі, уводныя словы. Уключэнне маўлення прыводзіць да перабудовы пачуццёвага пазнання, змянення суадносін мыслення і дзеяння.

Уяўленні пра ўзаемасувязі, існуючыя ў прыродзе і жыцці грамадства, якія атрыманы дзіцем у выніку паглыблення і ўзбагачэння яго сенсорнага вопыту, паглыбляюцца ў працэсе правядзення з дзецьмі эўрыстычных гутарак. Асноўнай іх мэтай з'яўляецца вырашэнне пазнавальнай задачы, што прадастаўляе вялікія магчымасці для фарміравання маўлення-разважання. Выкарыстанне эўрыстычных гутарак дазваляе фарміраваць у старэйшага дашкольніка ўменні, накіраваныя на выдзяленне істотных прымет прадметаў і з'яў, пабудову цэласнага разважання, якое складаецца з тэзіса, доказу, вывадаў.

У кола дзіцячага чытання ўваходзіць шмат літаратурных твораў маральна-этычнага характару. Абмеркаванне іх зместу з пункту гледжання аналізу прычын паводзін герояў, ацэнкі іх учынкаў спрыяе развіццю ў дашкольнікаў маральных меркаванняў, вучыць аналізу разнастайных жыццёвых фактараў. Знаёмства дашкольнікаў з мастацкімі творамі ўзбагачае іх

уяўленні пра нормы маралі, культуру паводзін у грамадстве. Пранікненне ў змест мастацкіх твораў маральнага характару патрабуе ад дзяцей высокай духоўнасці . Каб ацаніць учынак героя, дашкольніку неабходна перажыць падзеі, адлюстраваныя аўтарам, ён сам павінен асэнсаваць, «што такое добра і што такое дрэнна». У выхаванцаў фарміруюцца асобасныя адносіны да прачытанага. Слуханне літаратурнага твора ўплывае на думкі і ўяўленні дашкольнікаў. Яны жывуць разам з героямі твора, дзейнічаюць разам з імі, спачуваюць ім.

Лепшым спосабам развіцця лагічнага мыслення, моўнай здольнасці з'яўляюцца спецыяльныя гульні і практыкаванні, якія можна праводзіць з дзецьмі як у штодзённым жыцці, так і ў працэсе спецыяльных маўленчых і мастацкамаўленчых заняткаў. У навучанні дзяцей уменню разважаць выкарыстоўваюцца гульні з апорай на наглядны матэрыял і на вербальнай аснове. Пачынаць навучанне лепш з выкарыстання гульняў і практыкаванняў на нагляднай аснове. Нагляднасць, якая прадстаўлена карцінкай, прадметам, цацкай, дапамагае дзіцяці правільна і лагічна выразіць сваю думку ў звязным маўленчым выказванні. З дапамогай гульняў старэйшыя дашкольнікі вызначаюць ланцужок разважання, выдзяляюць яго структурнасэнсавыя часткі. У іх фарміруюцца маўленчыя навыкі, якія забяспечваюць выкарыстанне найбольш аптымальных сродкаў міжфразавай сувязі. Акрамя таго, маўленне старэйшых дашкольнікаў узбагачаецца спецыфічнай для дадзенага тыпу выказванняў лексікай. У працэсе навучання разважанню ў дзяцей фарміруюцца ўменні, якія накіраваны на вызначэнне галоўных прымет прадмета ці з'явы. Гэтыя ўменні неабходны дзіцяці для таго, каб, доказваючы, ён мог прыводзіць максімальную колькасць аргументаў.

Для абгрунтавання правільнасці сваёй думкі дашкольнік можа выкарыстоўваць апісанне прадмета або з'явы, падзеі, іх характарыстыку.

Апісанне дае магчымасць дзіцяці намаляваць слоўны партрэт прадмета, Пры гэтым старэйшы дашкольнік вызначае як істотныя, так і другасныя прыметы, дзеянні, якасці прадмета. Разам з тым менавіта апісанне дапамагае дзіцяці больш пераканаўча доказаць правільнасць свайго меркавання.

З задавальненнем старэйшыя дашкольнікі слухаюць казкі-загадкі, апавяданні-задачы. Іх адгадкі і рашэнні развіваюць у дзяцей здольнасць выдзяляць істотныя сувязі і заканамернасці, рабіць вывады. У працэсе вырашэння пастаўленых задач у дашкольнікаў развіваюцца навыкі і ўменні выкладання сваіх думак, яны вучацца разважаць. З пункту гледжання Н. Ф. Вінаградавай, рашэнне маўленчых лагічных задач спрыяльна ўплывае на развіццё ў дзяцей слоўна-лагічнага мыслення, што адпаведна знаходзіць адлюстраванне на іх звязных выказваннях. Маўленне дзіцяці становіцца больш даставерным, паслядоўным, пераканаўчым

Чым болей уяўленняў і ведаў атрымае дзіця пра навакольны свет, тым лягчэй яму будзе ў далейшым арыентавацца ва ўзаемасувязях і ўзаемазалежнасцях рэчаіснасці, адлюстроўваць іх у маўленні. Менавіта слова фіксуе вынікі пазнавальнай дзейнасці, менавіта яно замацоўвае іх ва ўсведамленні дзіцяці.

Неабходна заўважыць, што, развіваючы мысліцельныя здольнаці і звязнае маўленне дзіцяці, нельга спыняцца толькі на фарміраванні ў яго ўмення вырашаць прапанаваную задачу. Важна выхоўваць у дзяцей жаданне самім актыўна ўзаемадзейнічаць з навакольным светам, даследаваць яго, аналізаваць убачанае і прачытанае, ставіць пытанні і шукаць на іх адказы.

*SUMMARY*

*In the article we show how the language of explanation of a child progress. The author underlines the importance of this language in child's development.*

---

*УДК 37.02*

***С. А. Камінская***

# ТЭХНАЛОГІЯ ІНТЭРАКТЫЎНАГА ВЫХАВАННЯ ДЗІЦЯЦІ

Сучасныя канцэпцыі і тэхналогіі выхавання вызначаюць гульню як комплексны дыягностыка-карэкцыйны метад, гэта значыць, у ёй магчыма дыягностыка і карэкцыя ўсіх бакоў асобы дашкольніка. Менавіта гульнявая дзейнасць валодае самым высокім дыягнастычным і развіццёвым патэнцыялам.

Менш ясным, недастаткова раскрытым дашкольнай тэорыяй і практыкай уяўляецца значэнне гульні для маральна-эмацыянальнага выхавання як важнейшага боку развіцця асобы дзіцяці.

Як устаноўлена педагогамі, псіхолагамі і іншымі даследчыкамі, да 5—6-гадовага ўзросту «ў чарнавым варыянце» фарміруецца мараль-